# Урок беларускай мовы з прафарыентацыйным аспектам

## План- канспект урока беларускай мовы ў IX класе

**А. М. Жэўнерава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 12 г. Оршы

**Вывучаемая тэма, колькасць гадзін па тэме:** “ Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне”, 13 гадзін

**Месца ўрока ў вывучаемай тэме:** 8 урок па тэме

**Тэма:** Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах

**Тып урока:** урок замацавання матэрыялу.

**Мэта:** фарміраванне ўяўлення аб правілах пастаноўкі працяжніка паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах

**Задачы:**
- стварыць умовы для ўдасканалення арфаграфічных, пунктуацыйных, маўленчых навыкаў;
- стварыць умовы для развіцця псіхічных механізмаў, умення крытычна аналізаваць інфармацыю, ацэньваць і выкарыстоўваць на практыцы;
- спрыяць развіццю навыкаў сама- і ўзаемакантролю; забеспячэнню засваення вучнямі прынцыпаў камунікатыўнага ўзаемадзеяння ў вучэбных сітуацыях;
- садзейнічаць фарміраванню гатоўнасці вучняў да прафесійнага самавызначэння.

### Ход урока

**I. Арыенціровачна-матывацыйны этап.**

*1. Аргмомант.*

- Добры дзень! Рада бачыць вас сёння на ўроку. А зараз праверце, ці ўсё неабходнае для працы знаходзіцца на партах. Дэвізам сённяшняга ўрока мы зробім словы вядомага вам класіка беларускай літаратуры, педагога Якуба Коласа, з творчасцю якога мы знаёміліся і будзем падрабязна знаёміцца на

ўроках літаратуры ў красавіку: ”Добра быць у дарозе, якую сам сабе выбіраеш”.

Старажытныя грэкі казалі: «Добры настрой – палова перамогі!» Калі ў вас зараз добры настрой, падыміце зялёную картку. Спадзяюся, што да канца ўрока ваш настрой не пагоршыцца.

Сёння нас чакаюць розныя віды працы, а ацэньваць сваю работу вы будзеце ў індывідуальных рабочых лістах, якія ляжаць у кожнага на парце. Колькасць балаў за ўрок – 23,акрамя балаў за правільна выкананыя заданні, можна атрымаць дадатковыя балы ад настаўніка за актыўную працу на ўроку. Таму жадаю вам поспеху і актыўнай працы! А таксама балаў ад настаўніка.

*2. Актуалізацыя апорных ведаў.*

- Прапаную заданне “Такія **розныя** працяжнікі”. **(Слайд 2)**

Вазьміце рабочыя лісты ўрока і выканайце заданне №1. Вам неабходна ўпісаць умову пастаноўкі працяжніка ў кожным са сказаў. Самаправерка па ключы. **(Слайд 3)**

Прастаўце ў картку колькасць балаў, 1 бал за кожны правільны адказ, такім чынам, максімальна – 5 балаў.

**1. Акадэмікі і хірургі, паэты і маршалы – усе былі вучнямі.**
**2. Выбар прафесіі – адказны крок у жыцці старшакласнікаў.**
**3. Яшчэ некалькі дзён – і я буду працаваць на заводзе.**
**4. Прыйшоў працаваць – няма чаго часу каратаць.**
**5. Я працую настаўнікам, а сястра – урачом.**

**Ключ**
**1. Абагульняльнае слова.**
**2. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.**
**3. Складаназлучаны сказ.**
**4. Бяззлучнікавы сказ.**
**5. Няпоўны сказ.**

- Перабудуйце бяззлучнікавы сказ у складаназалежны, няпоўны – у поўны.

*3. Матывацыя, мэтавызначэнне.*

- Але праблемы і прабелы ў ведах яшчэ ёсць. Таму мы сёння працягваем працаваць над замацаваннем правіл пастаноўкі працяжніка ў бяззлучнікавых складаных сказах.**( Слайд 4)** (Запіс у сшыткі.)

Паглядзіце на тэму ўрока. Давайце з дапамогай адказаў на пытанні складзём навучальны маршрут.**( Слайд 5) Навошта? Што адкрыю і пра што даведаюся? Дзе выкарыстаю?** Вы бачыце значнасць і неабходнасць засваення гэтай тэмы.

А цяпер зноў звернемся да рабочых лістоў. Выберыце найбольш значныя для сябе задачы ўрока. **( Слайд 6)** (Агучваюць іх).

Задачы:
**- засвоіць правілы пастаноўкі працяжніка ў бяззлучнікавых складаных сказах;**
**- добра падрыхтавацца да праверачнай работы па тэме і кантрольнай работы;**
**- атрымаць добрую адзнаку;**
**- удасканаліць арфаграфічныя, пунктуацыйныя і маўленчыя навыкі;**
**- ______________________________________(свой варыянт)**

**ІІ. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

Выкананне трэніровачных практыкаванняў.

1. “ Тэарэтычная размінка”.

- Для таго каб вырашыць задачы ўрока, неабходна паўтарыць тэорыю. Калі ўзнікне праблема, можна карыстацца падручнікам. **(Слайд 7)** Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і тлумачэннем. Запоўніце прабелы. У калонцы прыкладаў прастаўце нумар сказа.

| **Адносіны** | **Можна ўставіць** | **Прыклад** |
|---|---|---|
| | а, але | 4 |
| Вынік | | 3 |
| | калі (перад 1 часткай) | 1 |
| Параўнанне | | 5 |

1. З рамяством дружыць – у жыцці не тужыць.
2. Маці вельмі хвалявалася куды паступіць дачка?
3. Яна сядзе за апарат, надзене навушнікі – вось ужо радыёграма прынята.
4. Вучаць, выхоўваюць не методыкі – вучыць, выхоўвае настаўнік.
5. Слова сказаў – сякераю адсёк.
6. Адразу стала зразумела такая прафесія мне не падыходзіць.

2. *Узаемаправерка па ключы.* **(Слайд 8)**. Памяняйцеся лістамі, ацаніце работу суседа. За кожны правільна запоўнены прабел і нумар сказа -1 бал, такім чынам, максімальна – 8 балаў. Якія сказы засталіся нявыкарыстанымі? Чаму?

3. *Абмеркаванне.* Сігналізуем каляровымі карткамі настрой.

– Мы рыхтуемся да экзаменаў, таму кожны ўрок паўтараем правілы арфаграфіі. Лінгвістычная фізкультхвілінка «Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў » дапаможа нам і адпачыць, і папрацаваць адначасова. Нашым дэвізам на гэтым этапе ўрока будзе: **( Слайд 9)**

**Калі табе не *ўсё роўна*, то рабі ўсё *як след.***

Запомніце выказванне-запомніце правапіс гэтых прыслоўяў.
Падняліся з месцаў. Умова выканання такая: калі слова пішам разам, то хлопаем у далоні, калі асобна – разводзім рукі. І памятайце пра наш дэвіз.
**Пазаўчора, штохвілінна, у адкрытую, урассыпную, зверху, з верху да нізу, як след, якраз, мімалётам, раз-пораз, усё роўна, уверх, таксама.**
Дзякуй. Прыселі на месцы.

**(Слайд 10)**
*4. Дзелавая гульня " У рэдакцыі".*
– Далейшая наша праца пройдзе ў форме дзелавой гульні «У рэдакцыі». Я галоўны рэдактар, буду прапаноўваць заданні, назіраць і адзначаць, як вы працуеце, як размеркавалі абавязкі, ці ўсе працавалі, ці ўмееце слухаць адзін аднаго. У нас чатыры аддзелы. Прызначым загадчыкаў аддзелаў. Яны будуць ацэньваць работу групы і ўдзел кожнага ў рабоце ўсёй групы. У вас ёсць інструкцыя па выкананні задання, калі ўзнікнуць пытанні, звяртайцеся да калегі па аддзеле. Калі ваш калега не зусім кампетэнтны ў вырашэнні праблемы, сігналізуйце галоўнаму рэдактару – падыміце чырвоную картку. ( Выконваюць заданні ў групах).

1. Аддзел культуры. Інфармацыя перадавалася спецыяльным карэспандэнтам. Падчас перадачы пачалася навальніца і ўзніклі праблемы з сувяззю – згублены некаторыя часткі слоў і нават цэлыя словы.
2. Перакладчыцкі аддзел. Матэрыял прыйшоў на рускай мове, трэба перакласці на беларускую, бо наша газета беларускамоўная.
3. Карэктарскі аддзел. Матэрыял прымалі па тэлефоне, запісвалі хутка, знакі прыпынку ставілі там, дзе паспявалі.
4. Літаратурны аддзел. Паразважаць на тэму " Мая будучая прафесія", пажадана выкарыстанне бяззлучнікавых сказаў.
   Тэксты запісваем у сшыткі.
   **(Слайд 11)**

Праверка. Такі тэкст атрымаўся? Выстаўленне адзнак загадчыкамі аддзелаў.
**Ляцяць гады – мы становімся дарослымі. Яшчэ нядаўна хадзілі ў дзіцячы садок – сёння заканчваем базавую школу. Перад намі стаіць пытанне аб выбары прафесіі. Не хочацца памыліцца. "Добра быць у дарозе, якую сам сабе выбіраеш", -- пісаў Якуб Колас.**

Пра якую жыццёвую дарогу раскажа нам літаратурны аддзел?

--- Кожнаму супрацоўніку рэдакцыі патрэбна ведаць, якія святы адзначаюцца ў краіне і як яны правільна пішуцца. Ці ведаеце вы, што ў лютым адзначаюцца 56 святаў, з іх 7 прафесійныя? Вам цікава даведацца пра некаторыя з іх? **(Слайд 12)**
Усе назвы святаў састаўныя, таму з вялікай літары пішацца першае слова.

Міжнародны дзень б**а**рмена (6 лютага), Міжнародны дзень стаматолага (9 ), Дзень камп’ютаршчыка (14), Сусветны дзень экскурсавода(21).Калі вам хочацца адзначаць сваё прафесійнае свята ў лютым, выбірайце такія прафесіі. Але, канечне, я не магу сёння не ўспомніць пра яшчэ адно важнае свята для мяне не толькі як настаўніка беларускай мовы, але і грамадз**я**ніна Рэспублікі Беларусь – гэта Міжнародны дзень роднай мовы, які адзначаем 21 лютага.
Наш спецыяльны карэспандэнт падрыхтаваў невялікую інфармацыю.
( Дадатак)

**III. Кантрольна-карэкцыйны этап**

1. *Выкананне міні-тэста.* Хутка вас чакае вялікі тэматычны кантроль. А зараз я прапаную выканаць міні-тэст, каб вы яшчэ раз паглядзелі, ці засталіся ў вас прабелы ў ведах па тэме**.( Слайд 13)**
   **Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік.**
   **1. Кожны можа выбраць свой шлях_ у сучасным грамадстве існуе шмат прафесій.**
   **2. Мы ў вас пытаемся_ вы адказвайце.**
   **3. Хочаш жыць у святле і цяпле_ сам здабывай агонь для сябе.**
   **4. Такі ўжо ў мяне характар_ усюды хачу папрацаваць**
   **5. Хочаш многа знаць_ трэба мала спаць.**

   Самаправерка па ключы. **(Слайд 14)**
   Выстаўленне балаў. Максімальна – 3.
   -Хто выканаў заданне без памылак? З адной памылкай?
   Падлічыце агульную колькасць балаў у рабочым лісце.

   **(Слайд 15)**
2. *Дамашняе заданне.* П.29, пр.145. Паўтарэнне. Правапіс не з дзеепрыслоўямі.

   **(Слайд 16)**

3\. *Рэфлексія.*
- Вернемся да задач урока. Ці дасягнулі вы іх?

Падыміце зялёныя карткі тыя, хто пойдзе з урока з добрым настроем.
( Чаму?) У каго засталіся пытанні? Хто не задаволены сваімі вынікамі?
**(Слайд 17)**

-Вы заўважылі, што ў нас сёння адзіная лексічная тэма? Гэта …(выбар прафесіі). Гэта вельмі актуальнае пытанне ў вашым жыцці. Засталося зусім мала часу да заканчэння школы, усе вы марыце аб адным: паступіць у тыя навучальныя ўстановы, якія ўжо выбралі або яшчэ выбераце для сябе. Хацелася, каб вы зразумелі, што, нягледзячы на тое, якая прафесія будзе ў вас у будучым, самае галоўнае, каб у любой сітуацыі вы заставаліся людзьмі.

І няхай словы Якуба Коласа , з трылогіяй якога “ На ростанях” мы будзем знаёміцца ў 9 класе на ўроку літаратуры, будуць не толькі дэвізам урока, але і вашым жыццёвым дэвізам.

## Рабочы ліст урока

**Прозвішча, імя**______________________________________________

**1. <u>Заданне 1. “Такія розныя працяжнікі”</u>**

1. ____________________________________________
2. ____________________________________________
3. ____________________________________________
4. ____________________________________________
5. ____________________________________________

**2. Выберыце з пранаваных задач урока сваю:**

 засвоіць правілы пастаноўкі працяжніка ў бяззлучнікавых складаных сказах;
 добра падрыхтавацца да праверачнай работы па тэме і кантрольнай работы;
 атрымаць добрую адзнаку;
 удасканаліць арфаграфічныя, пунктуацыйныя і маўленчыя навыкі;

______________________________________________

**3. Заданне 2.Тэарэтычная размінка**

| **Адносіны** | **Можна ўставіць** | **Прыклад** |
|---|---|---|
| | а, але | |
| Вынік | | |
| | калі (перад 1 часткай) | |
| Параўнанне | | |

1. З рамяством дружыць у жыцці не тужыць.
2. Маці вельмі хвалявалася куды паступіць дачка?
3. Яна сядзе за апарат надзене навушнікі вось ужо радыёграма прынята.
4. Вучаць выхоўваюць не методыкі вучыць, выхоўвае настаўнік.
5. Слова сказаў сякераю адсёк.
6. Адразу стала зразумела такая прафесія мне не падыходзіць.

**4. <u>Заданне 3.</u> Дзелавая гульня “У рэдакцыі”**

**5. <u>Заданне 4.</u> Міні- тэст**

**Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік**.

1. Кожны можа выбраць свой шлях_ у сучасным грамадстве існуе шмат прафесій.
2. Мы ў вас пытаемся_ вы адказвайце.
3. Хочаш жыць у святле і цяпле_ сам здабывай агонь для сябе.
4. Такі ўжо ў мяне характар_ усюды хачу папрацаваць
5. Хочаш многа знаць_ трэба мала спаць.

| Заданне | Заданне 1 | Заданне 2 | Заданне 3. Работа ў групах | Заданне 4. Міні - тэст | Балы ад настаўніка | Вынік |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Максімальная колькасць | 5 | 8 | 5 | 3 | 2 | 23 |
| Набраныя балы | | | | | | |

**Шкала пераводу балаў**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-4 б. | 5-6 б. | 7-9 б. | 10-11 | 12-13 | 14-16 б. | 17-18 | 19-20 б. | 21-22 б. | 23 б. |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |

## Перакладчыцкі аддзел. Заданне

Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

**Летят года – мы становимся взрослыми. Ещё недавно ходили в детский сад – сегодня заканчиваем базовую школу. Перед нами стоит вопрос о выборе профессии. Не хочется ошибиться. «Хорошо быть в дороге, которую сам себе выбираешь», -- писал Якуб Колас.**

## Карэктарскі аддзел. Заданне

Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.

**Ляцяць гады -- мы становімся дарослымі. Яшчэ нядаўна хадзілі ў дзіцячы садок сёння заканчваем базавую школу. Перад намі стаіць пытанне аб выбары прафесіі. Не хочацца памыліцца. Добра быць у дарозе якую сам сабе выбіраеш пісаў Якуб Колас.**

## Аддзел культуры. Заданне

Устаўце прапушчаныя літары і неабходныя знакі прыпынку.

**Л..цяць гады мы становімся даросл..мі. Яшчэ нядаўна хадзілі ў дзіцячы садок сё..я заканчваем базав..ю школу. Перад намі стаіць пыта..е аб выбары прафесіі. (Не)хоч..цца памыліцца. Добра быць у дарозе якую сам с..бе выбіраеш, пісаў Якуб Колас.**

## Літаратурны аддзел. Заданне

Скласці невялікі тэкст на тэму: "Мая будучая прафесія" з выкарыстаннем бяззлучнікавых складаных сказаў.

**Дадатак**

21 лютага ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Ён быў абвешчаны ЮНЭСКА. З прапановай увесці такі дзень выступіла краіна Бангладэш, дзе 21 лютага 1957 года, адстойваючы права вучыцца на роднай мове, загінулі пяцёра студэнтаў. Сярод 25 суаўтараў рэзалюцыі ЮНЭСКА аб гэтым свяце была і Беларусь. Прапануйце сваім бацькам,сваякам, сябрам 21 лютага паразмаўляць па-беларуску!